4. Колединский, Л. В. О начальной дате археологического изучения городов Беларуси / Л. В. Колединский // Проблемы истории отечественной археологии : тез. докл. конф. (11–13 дек. 1990 г.) / [Редкол.: И. Л. Тихонов (отв. ред.) и др.]. – СПб. : СПбГУ, 1993. – С. 83–84.
5. Наши постоянные и долговременные выставки / ratusha-vit.by – URL: https://ratusha-vit.by/ru/uslugi/nashi-postoyannye-i-dolgovremennye-vystavki (дата обращения: 15.03.2025).
6. Почобут, Н. А. Сохранение и изучение археологического наследия музеями БССР (1944–1991 гг.) / Н. А. Почобут. – Гродно : ЮрсаПринт, 2019. – 194 с.
7. Гурьянова, С. А. Роль частных собраний в становлении и развитии музеев г. Витебска / С. А. Гурьянова // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008 г. / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2009. – С. 176–184.
8. Шарковская, Н. Ю. Артефакты с Замковой горы из собраний Витебских музеев / Н. Ю. Шарковская // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння Л.В. Аляксеева, 28–29 кастр. 2010 г., Віцебск / Упр. культуры Віцеб. аблвыканкама, Віцеб. абл. краязн. музей ; рэдкал. : Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медисонт, 2012. – С. 155–195.
9. Шарковская, Н. Ю. Книги поступления о комплектовании фондов в первые годы работы Витебского отделения Белгосмузея (1925 – начало 1928 г.) / Н. Ю. Шарковская // 100 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навук. канф., Віцебск, 14 снеж. 2018 г. / [рэдкал.: Т. А. Старынская і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2024. – С. 11–56.

**Сямашка К.У., Сівохін Г.А.**

# ДАСЛЕДАВАННІ ЛАКАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ ЯК АСНОВА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ І ЭКСПАЗІЦЫЙНАЙ РАБОТЫ Ў МУЗЕІ. НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУКОВА-ЭКСПАЗІЦЫЙНАГА АДДЗЕЛА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА “ЗАСЛАЎЕ”

*Ключавыя словы: Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе”, навукова-даследчая работа ў музеі, архівы Беларусі, Уладзімір Марзон, Хвядос Шынклер.*

Музейнае даследаванне і прадстаўленне вынікаў гэтага даследавання не магчыма пабудаваць выключна на музейных прадметах. Безумоўным складнікам такой работы з’яўляецца работа з архіўнымі дакументамі. На гэта таксама накладаецца той факт, што музей з’яўляецца важнай інстытуцыяй, звязанай з практыкамі *публічнай гісторыі*. А музейную прэзентацыю – гэта можа быць і экспазіцыя, і экскурсія, лекцыя і пад., – варта разглядаць не як *рэч у сабе*, а як пэўны складнік цэлага комплексу акцый, скіраваных на дэкламацыю тых ці іншых гістарычных ведаў, якія грунтуюцца на артэфактах з музейнага фонду, архіўных дакументах, палявых даследчых матэрыялах.

У гэтым ключы мы маем разглядаць музейную работу як пэўную акцыю, якая дзеіцца ў рамках практык апублічвання гістарычных ведаў – як прэзентацыю вынікаў даследаванняў сродкамі публічнай рэпрэзентацыі праз “сумеснае” вывучэнне мінулага, а таксама яго “публічнага бытавання”. Пры гэтым музейны складнік такога *апублічвання* грунтуецца і на ўласна музейнай прэзентацыі, і на ейнай ***рэ***прэзентацыі – публічнай “сумеснай” інтэрпрэтацыі музейнага прадстаўлення, пабудаванага на артэфактах з музейнага збору і даследаваннях архіўных матэрыялаў.

І музейная прэзентацыя, і рэпрэзентацыя дасягаюцца шэрагам сродкаў, напрыклад, такім класічным сродкам, як музейная публікацыя – гэта могуць быць самы розныя гайды і каталогі па экспазіцыях ці па калекцыях, выданні (манаграфіі, зборнікі канферэнцый, перыядычныя выданні) і мультымедыйныя публікацыі, справаздачы, праспекты, экскурсійныя лісткі і брашуры, “аднадзёнкі” (афішы, постары, улёткі); мэрч (паштоўкі, рэпрадукцыі).

Аднак самым дзейным сродкам музейнай публікацыі з’яўляюцца менавіта музейныя прэзентацыі – часовыя і/або пастаянныя экспазіцыі, музейна-педагагічныя заняткі, лекцыі.

Даследаванні, якія праводзіць музей па вывучэнню музейнага прадмета, асобы ці гістарычнай з’явы пэўнай мясцовасці – уласна той, дзе і знаходзіцца музей ці адкуль

паходзіць музейны прадмет, – часта з'яўляюцца ўсяго толькі складовай часткай вывучэння больш шырокага кантэксту лакальнай гісторыі, якое грунтуецца перад усім на архіўных дадзеных. І такія "мікрадаследаванні" дапамагаюць вывучаць і інтэрпрэтаваць больш шырокі кантэкст гісторыі пэўнага локусу.

У музейнай рабоце існуе і зваротная сувязь – пры распрацоўцы экспазіцыйных, адукацыйных праектаў, культурных праграм работа грунтуецца не толькі на ўласна фондавых матэрыялах – якія, натуральна, часта таксама з'яўляюцца вынікам даследаванняў лакальнай гісторыі, – але і сама канцэптуальная частка праекта грунтуецца на плёне працы даследчыкаў, сканцэнтраваных менавіта на больш шырокім гістарычным кантэксце.

Значную частку такіх матэрыялаў у музейнай даследчай рабоце складаюць дадзеныя архіўных росшукаў. Такім чынам, музейная навукова-даследчая работа, у тым ліку і навукова-экспазіцыйная, у значнай ступені з'яўляецца вынікам архіўных даследаванняў.

У гісторыі Заслаўя хапае лакун, якія, нягледзячы на знакавасць мястэчка для Беларусі, абсалютна не даследаваныя. Аднак і тыя старонкі і "сівой даўніны", і ўжо блізкіх да нас часоў, якія быццам добра даследаваныя, занадта часта застаюцца пад покрывам гістарычнага змроку і забыцця. Таму адной з асноўных задач Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" (далей – Запаведніка) з'яўляецца рэпрэзентацыя лакальнай гісторыі і самога мястэчка, і вакольных зямель, якія былі з ім звязаныя – іх *апублічванне*.

У дадзеным артыкуле мы маем звярнуцца да досведу такой даследчай работы, якая грунтавалася ў значнай ступені на даследаванні і апублічванні – музейнай публікацыі, – архіўных матэрыялаў. У астатнія некалькі гадоў найбольш значнымі сярод такіх праектаў былі, верагодна, праект да 120-х угодак з нараджэння ў Заслаўі Хвядоса Шынклера "Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка" [12] і экспазіцыйна-выставачны фотадакументальны праект "Рамбам з нашага мястэчка", які ўяўляў часовую экспазіцыю, пабудаваную на фондавых матэрыялах трох музеяў і прысвечаны быў гісторыі заслаўскай медыцыны, з аднаго боку, і гісторыі выбітнага беларускага лекара, які паходзіць з нашага мястэчка, прафесара Уладзіміра Восіпавіча Марзона, з другога [17].

Праект "Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка" быў рэалізаваны ў калейцы навукова-адукацыйных і асветніцкіх праектаў Запаведніка "Этнаграфіка рэчавіду" і з'яўляўся партнёрскай акцыяй Запаведніка, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Музея гісторыі Беларускай чыгункі Цэнтра навукова-тэхнічнай інфармацыі БЧ і Мінскага абласнога краязнаўчага музея [13, с. 5].

Мемарыяльны праект "Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера", праведзены Запаведнікам разам са сваімі партнёрамі з 22 жніўня па 10 кастрычніка 2023 г., стаў важным культурным мерапрыемствам. Хвядос Шынклер, празаік, публіцыст і мысляр, з'яўляецца адной з ключавых фігур беларускай культуры XX ст., і гэты праект дазволіў бліжэй пазнаёміцца з яго жыццёвым і творчым шляхам. Праект уключаў некалькі ключавых кейсаў, кожны з якіх быў прэзентаваны адпаведнай складовай часткай – экспазіцыйнай зонай, – і накіраваны на раскрыццё канкрэтнага аспекту жыцця і творчасці Хвядоса Шынклера.

Асаблівае месца ў праекце было адведзенае прэзентацыі архіўных дакументаў. Так, біяграфічны складнік экспазіцыі мусіў быў быць арыентаваны на прэзентацыю вех жыцця пісьменніка. Гэты раздзел выставы асвятляў асноўныя этапы яго біяграфіі, пачынаючы ад нараджэння ў Заслаўі і да апошніх гадоў жыцця. У экспазіцыі былі

прадстаўлены фотаздымкі, дакументы, рэчавыя помнікі і рукапісы, якія дазвалялі наведвальнікам убачыць пісьменніка з розных бакоў.

Сярод шэрагу іншых дакументаў архіўны складнік экспазіцыі быў перад усім прэзентаваны ў зоне “Гістарычна-дакументальная хроніка”. Яна ўяўляла экспазіцыю архіўных дакументаў з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Верагодна, найбольш важнымі з дакументальнага фонду Хвядоса Шынклера, прадстаўленага на экспазіцыі, было ягонае ліставанне. Раскрыць лёс літаратара, жыццё падчас Другой сусветнай вайны, зразумець, як ён выжываў, хто і калі яму дапамагаў, а каму – ён сам, могуць дапамагчы гэтыя лісты. Важны складнік дакументальнага архіву – ліставанне з калегамі і сябрамі [1–4; 10; 11; 16; 18].

Але не менш, а, магчыма, яшчэ больш важнае – ліставанне з жонкай Ксеніяй і дзецьмі [7]. Гэтае ліставанне не толькі раскрывае шэраг старонак *рэальнага* жыцця Хвядоса Шынклера падчас вайны. Яно адкрывае шчымлівыя, досыць душэўныя ды інтымныя моманты дачынення двух блізкіх людзей у нялюдскіх умовах вайны.

Не менш важным аспектам прэзентацыі архіўных даследаванняў была дэманстрацыя зоны, прысвечанай “чыгуначна-тэлеграфнаму” перыяду жыцця Хвядоса Шынклера. І, верагодна, асабістыя справы яго самога [5] і яго жонкі Ксеніі [6], выяўленыя супрацоўнікамі Музея гісторыі Беларускай чыгункі, з’яўляліся найбольш важнымі і каштоўнымі прадметамі не толькі ў дадзенай экспазіцыйнай зоне, але і на ўсім праекце.

Такім чынам, дзякуючы архіўнаму складніку мемарыяльны праект здолеў папулярызаваць спадчыну Хвядоса Шынклера і спрыяў захаванню яго памяці. Сярод асноўных задач вылучаліся такія, як даследаванне і прэзентацыя біяграфічных і творчых момантаў жыцця творцы. Праект імкнуўся паказаць рознабаковыя аспекты жыцця і творчасці Х. Шынклера, уключаючы яго літаратурныя працы, жыццёвыя пертурбацыі і сацыяльную дзейнасць.

Не менш важнай задачай праекта была і папулярызацыя беларускай культуры. Арганізатары імкнуліся прыцягнуць увагу да беларускай літаратуры і культурнай спадчыны, падкрэсліваючы ўклад Шынклера ў развіццё нацыянальнай культуры.

Наступным аспектам работы над праектам, вынесеным у задачы па яго рэалізацыі, была адукацыйная дзейнасць. Праект даў магчымасць наведвальнікам глыбей пазнаёміцца з творчасцю Х. Шынклера і гістарычным кантэкстам яго жыцця.

Адным з галоўных дасягненняў праекта стала паспяховая папулярызацыя беларускай культурнай спадчыны. Наведвальнікі атрымалі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з творчасцю і асобай Хвядоса Шынклера, што спрыяла павышэнню цікавасці да беларускай літаратуры і культуры ў цэлым, садзейнічалі развіццю крытычнага мыслення і ўменняў аналізаваць літаратурныя і культурніцкія з’явы.

Асаблівай важнасцю праекта стала магчымасць захавання, аднаўленне і папулярызацыі многіх аспектаў, звязаных з жыццём і творчасцю Шынклера. У працэсе падрыхтоўкі да выставы былі адшуканы і сабраныя ў адно цэлае ягоныя аўтографы, рукапісы і фотаздымкі, якія раней былі “забытыя”, а таксама дакументы, звязаныя з жыццём беларускага літаратара. Акрамя гэтага, праект спрыяў усталяванню новых культурных і акадэмічных сувязяў. Былі наладжаны кантакты з іншымі музеямі, архівамі і даследчымі ўстановамі, што дазволіла пашырыць даследаванні творчасці Шынклера і ўзмацніць супрацоўніцтва ў галіне культуры, а таксама паглыбіць даследаванні па лакальнай гісторыі Заслаўя.

Другі праект – “Рамбам з нашага мястэчка”, – грунтаваўся на “перапляценні” даследаванняў па лакальнай гісторыі і быў плёнам сумеснай работы Запаведніка, Музея гісторыі медыцыны Беларусі і Бабруйскага краязнаўчага музея [19].

У дадзеным праекце на грунце архіўных матэрыялаў, з аднаго боку, і багатай калекцыі музейных прадметаў розных музеяў, з другога, было паказанае, як жыццё Уладзіміра Марзона, лёс якога час ад часу вяртаў доктара ў роднае мястэчка, перапляталася з родным яму Заслаўем, а, значыцца, і з яго "медыцынай" – не аднойчы ён прыязджаў у Заслаўе як выбітны лекар з кансультацыямі, а таксама абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР ад Заслаўскай выбарчай акругі. Таксама на базе архіўных матэрыялаў былі даследаваныя невядомыя старонкі сямейнай гісторыі, упершыню апублікаваныя менавіта ў рамках дадзенай часовай экспазіцыі. Даследаванні былі дапоўненыя вуснагістарычнымі матэрыяламі, атрыманымі ў выніку інтэрв'юавання сваякоў Уладзіміра Марзона [14; 15].

Перапляценні жыццёвай лініі доктара і гісторыі медыцыны яго роднага мястэчка, як і ўласна сама гісторыя станаўлення і развіцця заслаўскай медыцыны, – грунт сюжэтнай лініі, на якой была пабудаваная сцэнаграфія праекта, рэалізаванага ў рамках нізкі навукова-даследчых і адукацыйных праектаў навукова-экспазіцыйнага аддзела Запаведніка "Этнаграфіка рэчавіду".

Пры падрыхтоўцы праекта быў даследаваны шэраг дакументаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, які не ўвайшоў у саму музейную прэзентацыю, але дзякуючы якому быў раскрыты шэраг старонак жыцця і самога Уладзіміра Марзона, і яго сямейнікаў [1–4; 8; 10; 11; 16; 18]. Выкарыстаныя былі і дакументы з навуковага архіва музеяў-партнёраў праекта [9]. Гэтыя дакументы дапамаглі зразумець і раскрыць цёмныя плямы з жыцця галоўнага героя выставы, растлумачыць пэўныя аспекты, звязаныя з родам Марзонаў.

Агулам, праект быў прымеркаваны да Дня медычнага работніка Беларусі, які ў 2024 прыпадаў на 16 чэрвеня, а таксама да 130-х угодак з пабудовы медычнага комплексу ў Заслаўі па вул. Бялова, д. 5, – першай падобнай стацыянарнай установы на тэрыторыі сённяшняга Мінскага раёна.

Аднак у дадзеным тэксце перад усім важна было паказаць вынікі даследчай работы, выкананай падчас падрыхтоўкі праекта, і скіраванай на постаць як самога Уладзіміра Марзона, так і асвятлення гісторыі яго сям'і і сувязі роду Марзонаў як з Заслаўем, так і з некаторымі іншымі мястэчкамі і гарадамі Беларусі: Бабруйск, Ракаў, Мінск, Койданава і інш.

Такім чынам, можам канстатаваць, што ў музейнай навукова-даследчай і экспазіцыйнай рабоце архіўныя фонды займаюць адно з найбольш важных месцаў, прыкладам чаго могуць служыць шматлікія даследчыя і экспаізцыйныя праекты навукова-экспазіцыйнага аддзела Запаведніка. Так, падчас рэалізацыі праекта "Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка" апрача ўласна музейных прадметаў і прадметаў музейнага значэння было выкарыстанае больш за сотню архіўных дакументаў, у тым ліку з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтваў – 34 адзінкі захоўвання, з архіўнага фонду Цэнтра навукова-тэхнічнай дакументацыі Беларускай чыгункі – 6 адзінак і з архіўнага фонду навуковага архіва Запаведніка – 61 адзінка.

Для падрыхтоўкі экспазіцыйна-выставачнага фотадакументальнага праекта "Рамбам з нашага мястэчка" былі выкарыстаныя дакументы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. У рамках праекта экспанаваліся музейныя прадметы і архіўныя дакументы з музейных і архіўных фондаў Запаведніка, Музея гісторыі медыцыны Беларусі і Бабруйскага краязнаўчага музея, а таксама быў падрыхтаваны каталог матэрыялаў, якія экспанаваліся на выставе.

1. Дело о представлении помещицей М. Желиговской и крестьянкой А. Лапицкой, мещанкой Я. Морзон запродажной записи на им. Сярки Минского у. для засвидетельствования // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 147. Воп. 3. Т. 5. Спр. 18261.

2. Дело по жалобе крестьян Великосельской вол. на составление волостным писарем Морзоном подложных общественных приговоров, на увеличение себе жалования и других его злоупотреблений по службе // НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Т. 1. Спр. 15831.

3. Дело по жалобе священника Изяславской церкви Минского у. Г. Рункевича на противодействие писаря Морзона крещению еврея В. Дубронштейна // НГАБ. – Ф. 1567. Воп. 1. Спр. 82.

4. Земского врача Бацевичского участка Бобруйского уезда Морзона Владимира Иосифовича // НГАБ. – Ф. 324. Воп. 1. Спр. 1230.

5. Личное дело Шинклера Феодосия Сергеевича – телеграфиста ; 27.03.1919–27.12.1924 ; Западные Ж.Д. // Архіў Цэнтра навукова-тэхнічнай дакументацыі Беларускай чыгункі. – Ф. 257. Спр. 179. Ад. зах. 14530.

6. Личное дело Шинклер-Яришко Ксении Игнатьевны ; 21.06.1919–30.12.1927 ; Западные Ж.Д. // Архіў Цэнтра навукова-тэхнічнай дакументацыі Беларускай чыгункі.

7. Лісты Х.С. Шынклера да жонкі. 29.04.–18.10.1942 // Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 300. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 3, 6, 18, 19, 25.

8. Марзон Анна Іvановна [электронны рэсурс] / Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь // Партызаны Беларусі [сайт]. – URL: https://partizany.by/partisans/212137/ (дата звароту: 21.01.2025).

9. Марзон, У. В. Аўтабіяграфія : пашпарт навуковы прадмету музейнага // Бабруйскі краязнаўчы музей ; Музейная калекцыя “Рукапісы”, шыфр “Р”. – URL: СКБД “ІДС «Музей–5. Улікова-фондавая дзейнасць»” (дата звароту: 10.04.2024).

10. О крещении еврея Юделя Морзона // НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 24. Спр. 6341.

11. Отношение Приступствия с уведомлением минской дирекции народных училищ и мирового посредника Минского у. о награждении писаря Станьковского волостного правления О. Морзона серебряной медалью на Станиславской ленте за участие в деле народного образования // НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Т. 1. Спр. 1814.

12. Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка. Мемарыяльны праект да 120-х угодак з нараджэння ў Заслаўі Хвядоса Шынклера // Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе” [сайт]. – URL: http://zaslaue.museum.by/be/node/69976 (дата звароту: 15.12.2024).

13. Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка. Праектная дакументацыя на стварэнне часовай экспазіцыі ў рамках нізкі навукова-даследчых і адукацыйных праектаў “Этнаграфіка рэчавіду” / Г.А. Сівохін, К.У. Сямашка // НА ГКМЗ (Навуковы архіў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”). Ф. 2. Воп. 7. Спр. “Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка”.

14. Палявыя матэрыялы аўтара (ПМА) ; інфармант – ВІЈ ; зап. у г. Мінску ад, жан., 1919 г.н., нар. у г. Мінску.

15. ПМА ; інфармант – ММА ; зап. у г. Мінску ад жан., 193? г.н., нар. у г. Мінску.

16. Препроводительная присутствия Минскому уездному присутствию к жалобе крестьян Раковской вол. на увеличение содержания волостному писарю Морзону и фельдшеру // НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Т. 8. Спр. 16558.

17. Рамбам з нашага мястэчка. Праектная дакументацыя на стварэнне часовай экспазіцыі ў рамках нізкі навукова-даследчых і адукацыйных праектаў “Этнаграфіка рэчавіду” / Г.А. Сівохін, К.У. Сямашка // НА ГКМЗ (Навуковы архіў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”). Ф. 2. Воп. 7. Спр. “Рамбам з нашага мястэчка”. Арк. 1–47.

18. Уведомление минской казенной палаты о перечислении земли крестьянки Лапицкой помещице Я. Морзон // НГАБ. – Ф. 321. Воп. 1. Спр. 62.

19. Фотадакументальны праект, прысвечаны гісторыі медыцыны г. Заслаўя і выбітнаму лекару, ураджэнцу Заслаўя Уладзіміру Марзону “Рамбам з нашага мястэчка” // Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе” [сайт]. – URL: http://zaslaue.museum.by/node/76623 (дата звароту: 15.11.2024).

**Плытник Е.Г.**

## МУЗЕЙНЫЙ САЙТ КАК ИСТОЧНИК ИЗУЧЕНИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ МУЗЕЕВ

*Ключевые слова: музей, Интернет-сайт, музейный сайт, источник информации, Эрмитаж.*

Последние годы много внимания уделяется изучению теоретических и практических аспектов деятельности музеев: проводятся исследования, результаты которых публикуются в научных изданиях; по музееведению защищаются кандидатские и докторские диссертации. Внимание исследователей не ограничивается историей музейного дела: многие работы посвящены современному состоянию отечественных и зарубежных музеев – анализируется их деятельность, специфика работы, рассматриваются современные практики. При этом ученые сталкиваются с проблемой сбора материалов и слабой источниковедческой базой для проведения исследования. Основными источниками информации выступают отчеты музеев, официальные страницы в социальных сетях и, конечно, музейные сайты. В связи с этим